БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папрауляць перасыланые рукапісы і карэспонденцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 ру[illegible] на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 37. Менск. Чацьвер 9 мая 1918 г. Год I

АБВЕСТКІ.

Медыцынскі Аддзел Местовай Управы апавешчае, што а Юрьеускай 13 адчынена Цэнтральная Амбулаторыя для пужачых Местоваго Самаупраулення і іх сямействаў, а так ама для усіх грамадзян м. Менска.

Прыем раніцой ад 9 гадзіны: па унутрэннім і дзіцячым варобам—д-р Дулевіч, вочным, вушным, насавым—д-р. льяноу, надскурным і венэрычным—д-р. Яхнін, зубным—др. йнгорн. Пры амбулаторыі есьць зуботэхнічны габінэт для пукарных зубоу і протэзоу—зуб. ур. Монцэвіч.

Дзеля мажлівасьці, што у хуткім часе будзе пазволено ямецкай уладай прыватным асобам, установам, фабрыкам, аводам і інш. карыстанне тэлефонамі па месту Менску, Метовая Управа просіць абонэнтау (быуш. Менскай Упраускай Тэлефоннай сеці) жадаючых быць уключаннымі у лік абонэнтау Местовай Тэлефоннай сеці, падаць аб гэтым заяву Сэкрэтару Управы з акуратным указаннем установы, адрасу, ічбы апаратау і №№ быушых апаратау.

Менск-9/v.

Найлепшая палітыка—гэта праца. Палітыка адарваная ад рэяльнаго грунту, ад жыцця, можа быць яскравай на погляд, можа як пекны бэнгальскі агонь пераліванца усімі колярамі у паветры, захапляючы вока, але па ей застанецца толькі дым, — часамі шкадлівы для людзей.

Вайна адарвала у Расіі аграмныя массы ад працы творучай рэяльныя, жыццевыя вартасьці і кінула іх на дарогу зьнішчэння гэтых вартасьцяу, зробленых стараннямі другіх.

Ні толькі Усходняя Прусія, але і Польшча і Літва і Прыбалтыка і Беларусь пазнаі што можа зрабіць чалавечая масса кіраваная на зьнішчэнне. Безглузда ні здаючы сабе здання с таго што яна робіць і нашто робіць, агаляла расійская армія прайдзеныя ею абшары. Як саранча адступала яна назад, пакідаючы за сабой мертвае поле, а перад сабой чуючы праклёны мільенау выганяных у цэнтр Расіі і у Сыбір «бежанцау».

Масса адарваная ад працы шчыра ужо бачыла усе прыбыткі ад працы і старалася...

Рэвалюцыя, дала магчымасьць гэтым адарваным ад працы массам заняцца палітыкай. І «рядовой Іванов» ні маючы другой работы шчыра узяуся за палітыку.

Ні маючы патрэбнаго для палітыкі навуковаго дасьведчэння ані жыццевых досьледау «рядовой» ведау за тое добра адно слова «не желаю». Так апрыкрэу яму увесь папярэдні парадак, што толькі на гэтым слове ен і мог запыніцца. «Не желаю» цара, «не довѣряю» кадэтам, «не подчиняюсь» Керэнскаму,—не, не і не.

Сваіх бажанняу ен досыць ясна ні ведау і калі перабраушыся у фрак Леніна, пачау тварыць жыцце каб у ім ні было ні воднаго «не», то зайшоу у тупік, ад катораго цяпер мусіць «адступаць і адступаць».

Можа каб ні было гэтаго нішчасьця, што Іванова адарвалі ад плуга і ад машыны, ен моу-бы і другія мовы апрача «не» і «ні», але адарваны, ад свайго грунту ен пакінуу на ім і увесь свой здаровы розум.

Беларусь, на наша нішчасьце іншчэ ні уся, выправадзіла паволі усіх «Івановых» дамоу і цяпер адпачывае ад іхняй палітыкі, каторую яны і гэтта завялі.

Народ, каторому ні перашкаджаюць болей цемныя Розумам прарокі «сьветлай будучыны» на скорую руку папрауляе свае гаспадарскія прылады і рушае на звычную для яго спакойную і мілую работу.

З усіх бакоу да нас ідуць весткі што зямляробы нашыя рупяцца засеваць палі, каб забезпэчыць хлеб краю. «На Бога палягай, кажуць, а сам ні драмі.» На Украіну нам ні спадзевацца, як свайго хлеба ні будзе.

Селяне уласнымі сіламі узнауляюць збураны парадак. Німа больш тэатральна-эффэктных мітынгау, якіх пачынальнікамі былі «Івановы», але усе робіцца з даунейшай суседскай згодаю. Гарады і мястэчкі, жыцця якіх вішчадна калечылося усімі акалічнасьцямі якія прынесьлі з сабой сюды сперша мілітарызаваныя, а потым рэвалюцыянізаваныя расійскія массы, так сама варочаюцца да нармальнаго укладу жыцця. Цяпер як і за звычай даунэй у горадзі пазнаеш, што жыць- значыць працаваць, а ні мітынгаваць.

Праца творучая рэяльныя творчасьці паволі адраджаецца на усей Беларусі. Для яе найлепшаго развіцця апрача грамадзянскаго спакою, які дала нам збавіушая нас ад «івановых» нямецкая армія, патрэбен грамадзкі лад, і такі каторы захавауся бы па даужэйшы час, будучы адпаведным духу народа і праудзівым, жыццевым яго патрэбам.

Рада Рэспублікі, ад нідаунаго часу так сама уступіла на шлях гэтай рэяльнай творчай працы.

Расьцець с кожным днем зьвязак Рады с провінцыяй. Палітыка Рады акунаецца глыбей у рэяльнае жыцце. Узмацоуваецца грунт беларускай дзержаунасьці.

Так праца—гэта найлепшая палітыка абнімае цяпер усю Беларусь ад верху да нізу.

Абразкі с правінцыі.

(Па даугінаускаму гасьцінцу).

Вясновая ночка. Месячны серп ярка - чырвоны, агнёвы стаіць над вёскай. На розныя лады квохчуць жабы. На спатканне мне некалькі хлапцоў с храмым Язэпам на пэрадзі.

— Добры вечар!

— Вечар добры!

— Куды пусьціліся?

— Гм...

— Ды куды-ж?

— На палеванне.

— Ну-ну!?

— Ідзі, пабачыш.

Я пайшоў.

Прайшлі в [illegible] па гасьцінцу і [illegible] слухоўваюцца. Маўчаць. Раптам навастрылі вушы. У начной цішы пачуўся грукат калёсаў па гасьцінцу і нуканне на канёў. Галасней і гульчэй —і цэлы абоз паказаўся на ўзгорку. Тут хлопцы выскачылі і крыкнулі. «Стой!

Туды—сюды і давай намацываць тое, што ляжыць у вазох. Шукалі—шукалі і знайшлі два мяшкі з мукою і некалькі булак хлеба. Сьвіснулі і з вёскі раптам з'явілася фурманка. Мяшкі ўзвалілі на фурманку, якую адразу адправілі у вёску дзяліць паміж галодными.

Колькі я ні напрасіўся атправіць гэта у магазын і саставіць пратакол аб тым скольکі чаго у каго забралі—ні памагло.

Шум, гармідар і лаянкі. А паміж ўсім гэтым чуецца плач старой кабецины—гэта ее хлеб забралі... Яна качаецца па зямлі ды прычытвае, просіць-моліць... Апошнія свае грошы аддала на хлеб. Купіла у Даўгінаве, каб завясьці дзецям сваім у Менск.

— Аддайце...—моліць яна. Ні мог памагчы у гэтым і я. Як галодныя ваўкі, хлопцы накінуліся на хлеб і давай тут жа на[illegible]мейсцы дзяліць і тут жа есьці...

Кабеціна плачыць, а хлопцы сьмяюцца...

— Усю зіму мы гэтак хадзілі на палеванне!—Хвалюцка мне хлопцы,—але скора мусіць—баста, ні напалюеш, бо чутно немяц йдзе...

З.

Агульныя вестĸі.

ВЕНА. З веры годных крыніц наказываюць, што часьць чорнаморскаго флота, выехаўшаго нет ведама куды, вярнулася ў Адэсу і пакарылася новаму ураду.

ТОКІО (В. Т. Б.-Рэўтэр). Расейскія ўласьці арыштавалі ў Курску японскаго віцэ-консула і галаву таварыства, вінавацячы іх у [illegible] [illegible] усходнім беразі Іордана ўсе атакі англічан адбіты. Узяты палонныя, некалькі куляметаў і панцырны самаход.

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ. Турэцкая дэлегація выехала ў Батум.

БЭРЛІН. Маршалак францускаго парлямэнту ў апублікованай справаздачы кажа, што Францыю жджэ выміранне нацыі. На 2 прыпадкі сьмерці прыходзіцца толькі 1 прыпадак урадзін. «Што нам гэта паможэ, калі мы абаронімся ад страшэннаго наступлення і праславім Францыю на ўвесь сьвет, але пасьля пабеды акажэмся скінутымі з нашаго сусьветнаго палажэння і ўчынім самагубства?».

БЭРЛІН. На прывітальную тэлеграму нямецкаго тарговаго кангрэсу імпэратар паміж іншым адказаў:

«Ахвяры меннем і крывёй ні павінны быць дарэмны. На гэта маюць роўнае права як гаспадары, так і іх работнікі.»

Гіндэнбург адказаў:

«Калі ўвесь нямецкі народ будзе стаяць разам, дык мы здабудзем такі мір, каторы дасьць новы расцвет тарговлі і прамышленнасьці.»

БЭРЛІН. У часі апошняго наступлення мы захапілі ваенныя паперы, ў каторых гаворыцца, што начальнікі павінны зьвертаць увагу сваіх салдатаў, што нельга спадзевацца хуткай помачы амэрыканцаў.

БАЗЭЛЬ. Новы прэзыдэнт Португаліі зьвярнуўся да саюзнікаў с цыркулярнай нотай у справе ўчасьця ў вайне португальскіх войск. Ад пачатку студня на заходнім фронці ні прыбывало новых португальскіх войск.

БЭРЛІН [В.Т.Б.] Рэўтэр кажа што Зээбрюгэ зачынено ад мора, і што нямецкія падводныя лодкі ні маюць магчымасьці выхадзіць з Гэльголяндзкай затокі. З асьвядомленай крыніцы паказываюць, што гэтыя весткі нізгодлівы с праўдай. Зносіны падводных лодак з морэм зусім свабодны.

ЛОНДОН. (Рэўтэр). Кароль назначыў фэльдмаршалка Фрэнч[illegible] [illegible]

сэкрэтаром скарбу Ірляндзіі.

БЭРЛІН. Урадова. У паўночных водах ізноў затоплено 12.000 т.

БЭРЛІН. Урадова. 2.V. У паўночных водах затоплено ізноў 19.000 тон.

БЭРЛІН [В.Т.Б.] У Ірляндзкім моры і ля заходняго узьбярэжжа Англіі нашы падводныя лодкі ізноў затапілі 37.000 тонн.

ВЕНА (В.Т.Б.) На ўсенькім італьянскім фронці ад Юдікарыі да Адрыі значна узмацавалася баевая чыннасьць.

ВЕНА (В.Т.Б.) 5.V. Артылерыйскія бітвы на ўсенькім палудзенна - заходнім фронці трываюць далей,

РЫМ (СТЭФАНІ). Чэскіе і словацкіе войскі, організованые ў Італіі, высланы ўжо на італьянскі ваенны тэатр.

КОПЭНГАГА. Вялікія расійскія сілы сабраны на поўначы ад Пецярбурга. Расійскіе пагранічные войскі, парушаючы нэутральнасьць, абстрэліваюць фінляндцаў.

Весткі з Расіі.

БЭРЛІН (В. Т. Б). 4 V. Расійскі камісар дзеля загранічных спраў, Чычэрын, паслаў французкаму ураду іскровую тэлеграму, ў каторай м.ж іншым гаворыцца:

«Расійскі ўрад, ні гледзячы на зніштэнне Расіі, ні можа дапусьціць, каб чужынцы мешаліся ў унутрэные справы Расіі і гразілі адарваць ад ле часць зямлі. Японская высадка ў Владывастоку гэта акт марскога грабежства, проці каторага Расія будзе бароцца ўсімі спосабамі. Яна пратэстуе проці спроб французкага пасла перайначыць гэты крок Японіі і трэбуе, каб расійскі пасол у Францыі вярнуўся назад».

МАСКВА. «Утро Россіи» наказывае с Токіо, што між Англіей і Японіей зроблена новая тайная умова, каторая дае японцам поўную свабоду ў ле палітыцэ на Далёкім Усходзі.

г. Богородыцк (Тульск. губ.).

(Ад уласнаго дапішчыка).

Большэвікі, якія цяпер называюць сябе, «коммуністамі», паняверaюцца народам па даўнейшаму, хаця усё сьведчыць што зблiжаецца канец іхняго панавання.

Большэвікі крычаць вылазячы з скуры аб абавязках грамадзянства да «савецкай фэдэратыўнай» рэспублікі, але ніхто іх ні слухае, усе іх гудзяць і стараюцца рабіць па свойму.

Салдаты, даваўшыя раней найбольшую лічбу прыхільнікаў большэвізму, усе паперабляліся на с.-р., праграма каторых больш памеркаваная.

«Чырвоная гвардыя» разышлася па сваім хатам, а у «армію» ісьці лепшыя людзі ніхочуць.

Апрача [illegible] у краўцым жыцці, ніздаволенне большэвікамі выклікаецца бязладам у харчаванні. У гарадох—заўсёды пригроза надыходзячаго голаду. У нас, напрыклад хлеба выдаецца па $1/2$ ф. на чалавека, дый той на палавіну мешаны з аусом. У селян па ніекаторых мейсцах хлеб хаця і ёсьць, але баяцца аддаваць, каб ні апынiцца самім ні с чым.

Агульчае палажэнне такое, што сам Ленін змушаны быў прызнацца на ўсерасійскім з'езде «совдепов»: «мусім адступаць і адступаць, пакуль ні падніменца заходні пролетарыят».

Аб нашай Беларусі у большэвіцкіх газэтах [illegible] ні мала, але добра ўспамінаюць радка.

М—ь.

Весткі с Польшчы.

Подлуг паведамлення бюро друку прэзыдыума Рады міністраў, 1 мая адбылося пасядзенне Рады міністраў на якім імі і былі разгледжаны справы аб пераняцці ад акупацыйных уладаў харчовых агенд. Нормiраванне судовых аплатаў, апека над патрэбамі штукі пры судовых зачыненых урадавымі установамі, пашырэння апекі над палоннымі палякамі у цэнтральных дзержавах і выроблена опінія да праэкту акупацыйных уладаў у справе новых падаткаў і ў справе унутрэнай арганізацыі вайсковай камісіі.

Подлуг паведамлення «Deutche Waoch. Ztg.» 2 маю Імпэрска-нямецкі камісар пры каралеўска-польскім урадзе гр. Гуттэн-Чапскі уладзіў у сябе вечар, на каторым сярод запрошанаго варшаўскаго грамадзянства былі высшыя чыны нямецкай окупацыйнай улады, члены Польскай Регенцкай Рады усе члены габінэту міністраў і шмат відных дзеячоў на полю наукі і палітыкі.

На Польшчы ідзець рыхтунак да набору у армію. У армію будуць заклікаиы ні усе здольныя да службы ад 1897 году, але толькі пэўная, агранічаная лічба людзей. Гэткім чынам з тых якія ужо ёсьць цяпер войск далучыўшы да іх нанова прызваных, будзе створана брыгада з двайным запасам ахвіцэраў, якая паслужыць кадраю будучаго войска.

(З «Dz. Polsk.»)

Беларускі тэатр.

У «Беларускай Хаці» (Конскі рынак) на першы дзень Вялікадня 5 мая быу пастаулены 1-м Т-вам Беларускай Драмы і Камэдыі ангельскі фарс: «Цетка вінавата». Ні зважаючы на тое, што са сцэны сыпаліся [illegible] для беларускага вуха [illegible]міны: містэр, «льорд», «місс» і г. д., фарс прайшоу вельмі гладка, захапіушы публіку сваім цікавым сюжэтам, парываушым на ніустрыманы сьмех. Сьмешлівасьць гэтаго фарсу у тым, што сама цетка хвальшывая—мушчына у парыку і адзежы кабеты.

Маладыя студэнты Робэрт Чэснэй і Кароль Выкэм запрашаюць да сібе пляменніцу містэра Спэцінга місс Кэтті і яго выхаванку місс Лілі. Каб дзяучаткі прышлі на гэтыя запросіны, студэнты карыстаюць с таго здарэння, што да Кароля мае прыехаць яго цетка донна Люцыя д'Альвадорас бразыльская мільенэрка. Але цетка дае тэлеграму, што спазнілася і вось у назначаны дзень студэнтам німа чаго рабіць, каб выйсьці с такога палажэння як ім хацелося б. Астаецца толькі адно: змайстраваць цетку. Для гэтай ролі яны скарысталі свайго калегу льорда Бобэрлея, каторы і мусіу бічнавацца у свaей ролі, аж покі ні прыехала праудзівая цетка, якая зразумеушы, што гэта жарт, назвала сябе «містрыс Томсон».

Каля хвальшывай цеткі увесь час увіваліся і льорд Чэснэй—бацька Робэрта і містэр Спэцінг, каторага найгорш збаламуцілі, пакінуушы яго у дурнях у канцу пьесы.

Бобэрлея і хвальшывую, канешна, цетку іграу сам рэжысэр Ф. Ждановіч, падымаючы ніраз на сьмех усю публіку даскананальным выказваннем гомэрычных момэнтау фарсу.

Слуга Бэбс (К. Мядзіолка) выйшоу нізгоршым.

Як мае быць веу ролю Спэцінга—Пятровіч; уся яго фігура аж гарыць да гэтай ролі.

Больш ролі мушчынскія ні так удзячныя для артыстау каб у гэтых ролях была магчымасць паказаць сябе. Кабечыя ролі так сама ні выдатдатныя. Толькі, калі прыпомнім, што «Цетка вінавата» ставілася нашым маладым тэатрам ужо другі раз, то мусім адзначыць, што на гэты раз роля праудзівай цеткі (В. Тарасік) аддана была у лепшыя рукі. А у першы раз (імя артысткі? нівядомае) на сцэну выходзіла надта паважная кабета, але што яна хацела гаварыць—пацеры ці ролю сваю—ніяк ні можна было пачуць. От, заняло ей мову ды годзі.

Ціпер гэта абмылка рэжысэрам чекна папраулена і будзем спадзевацца што больш мы яе ні убачым.

Знаемы.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

У Менску гэтымі днямі гасьціу культурна - грамадзянскі і палітычны дзеяч, член Віленскай Беларускай Рады, п. В. Ластоускі.

У часе свайго кароткаго побыту п. В. Ластоускі, абзнаеміу тутэйшыя уплывовыя беларускія колы, с становішчам школьнай справы і агульнай прасьветы за час вайны у «заакопнай Беларусі».

Карыстаючы с прыпадку, ні можам ні успомніць з удзячнасьцю аб той вялікай працы, якую В. Л. паклау для нашай культуры і прасьветы. За вайну толькі шаноуны наш грамадзянін пасьпеу напісаць, укласьці і выдаць каля 10 школьных падручнікау для нашых школау і столькі-ж пасьпеу прыгатаваць да вы- [illegible] дання. Апрача пісьменніцтва і выдауніцтва В. Л. адначыуся як арганізатар т-ва апекі над дзяцьмі «Золак» у Вільні, пры якім істнуе школа на больш як сотню (каля 150) дзяцей.

Усе пачтова - тэлеграфныя служачыя—беларусы, якія хочуць часова пакінуць межы Беларускай Народнай Рэспублікі, але па адчыненні пачтова-тэлеграфных установау на тэрыторыі Беларусі пажадаюць вярнуцца на сваю бацькаушчыну г. з. у тыя установы у якіх яны служылі да акупацыі краю, ніхай зарэгістрырююца у Пачтова-тэлеграфным Рэгістрацыйным Бюро пры Радзе Беларускай Нар. Рэспублікі (Захароуская 43) 3-ці этаж.

Бюро адчынена штодзенна ад 1 да 3 гадз. у дзень.

Дзеля уладжывання харчоу с сягоняшняго 9-го мая забаронена выпечка кандытарскіх печэнняу і выдача цукру у кавярнях і сталоуках.

Мясо будзе выдавацца раз на тыдзень па талонам толькі у нядзелю. Цукер будзе вадавацца па бонам па $1/4$ ф. на душу у тыдзень. З 8-го мая спынена прадажа каубасы, якая за апошнія дні прадавалася вельмі танна:

С каніны по—1 р. фунт.
Літоуская —2 р. »
Кракоуская —$2^1/_2$ р. »
Сало —2 р. »

Што датычыцца хлеба, то разделу крамау на кварталы па альфавітнай сістэме покуль што ні наладжэна яшчэ. Тыя самыя хвасты, тая самая лаянка і нідахват хлеба.

Ад выехаушых на Украіну па харчы харчовых дзеячоу пакуль што ніякіх вестак німа.

Эвакуацыя уцекачоу ідзець хуткім тэмпам. Польскі бежанскі камітэт вельмі шмат працуе у гэтым кірунку. Прышчэпліваецца воспа, пасьля чаго выдаецца пропуск а затым ідзець самая атпраука партыямі—па 700 чалавек у дзень і болей; з 8-го мая у 2 напрамкі: у Польшчу і Літву.

Афіцэрскае бюро так сама старанна працуе: у канцы гэтаго тыдня выезджае 3-й эшалон—уражэнцы Польшчы і Літвы, нізалежна ад эвакуіруючых у Расію што дня па 50 чал. У акупаваныя мейсцы афіцэрскае бюро мае адпрауляць і у адзіночку.

Харчовая рэгістрацыя асеушых у Менску афіцэрау, дахтароу і чыноунікау пачнецца з будучаго тыдня; дзеля іх с сем'ямі адчыняецца у памешканні бюро сталоука. Слаба эвакуіруюцца украінцы, дзеля кепскіх матэр'яльных варункау.

Назначаны архіепіскопам ме[...]скі епіскоп Гэоргій пастанова[...] ўсерасійскаго цэркоунаго с[...]бору у Маскве, дзе ён лічы[...]ца членам. Владыка Гэорг[...] вядомы у духоуным сьвеці [...] вучоны богаслоу. Заслуга[...] еп. Гэоргія у цяперашні м[...]мэнт— неумешыванне (раза[...] з духавенствам) у палітык[...] бо, як ведама, б. архіеп. Мі[...]рофан за бязмернае „паліты[...]канство" быу адосланы у Ас[...]рахань, дзе жыве цяпер.

Сярод кватэрантау, пры ц[...]перашніх рэзкіх упадах н[...] на жылішчы, усе-ж такі ме[...]сцамі чуецца скарга з—за в[...]лікіх надбавак да платы, [...] гледжучы на істнуючую сп[...]цыяльную прымірыцельную к[...] мэру.

Гэту меру прынялі дома[...]ласьнікі на Каломенскай вул[...] на Белацэркоунай і інш.

Замест быушай дагэтуль м[...]сячнай платы 40 р.—70 р.!

Дзеля «тыдня апекі» сягонн[...] 9-го мая у інтымным тэатр[...] а 8 гадз. вечару ставіцца бе[...]ларускі спэктакль.

Заутра—вялікая дзяціная г[...]лянка а 3 гадз. у дзен у садз[...] «Рэнессанс», с дзяціным спэк[...]таклем, гульнямі, пеннем, ско[...]камі і музыкай.

У суботу і нядзелю—у «Рэ[...]несансі» 2 канцэрты с хора[...] ад $6^1/_2$ час. вечера.

Увесь збор ад „тыдня апекі[...] ад 6-го на 12-е мая пойдзе [...] карысьць галодных.

У мествай управе паралел[...]но з уменьшэннем штатау слу[...]жачых з адной стараны утва[...]раюцца новыя аддзелы з но[...]вымі служачымі з другой ста[...]раны. Такім чынам адчыняец[...]ца аддзел пад назваю: «счет[...]но-контрольный отдѣлъ».

На Троіцнім пляцу у Вяліко[...]дную сераду, 8 мая, падво[...] быу вельмі слабы:

дровы бяроз. воз—30—37 р.
меньшы вазок — —20 р.
квасное малако— 1 р. 40 к.

другіх прадуктау ні было.

Курсы беларусознауства

9 мая Лекцыя праф. Массо[...]ніуса «Гісторыя Беларускаг[...] языка.»

Афіцыяльнае паведамленне нямецкаго вярхоуна[...] камандавання за 8 мая 1918 року.

З А Х А Д: Паўднявей Ньюпортскаго канала мы з[...]брали ў палон бэльгійцаў пры спагадаючай разьведцы. [...] полі бітвы ў Флядрыі і каля р. Ліс артылерыйскі аго[...] памоцнеў каля Кэммелю ў нас каля Бэйёля. У схватках [...] палех бітвы каля Соммы былі ўзяты ў палон ангельцы [...] французы. Па абодвых бакох дарогі Корбі-Браг ніпрыяце[...] ніўдачліва атакавау нас, пасьля моцнаго артылерыйскаго [...]ню. Нашым агнем былі моцна пабеджаны ніпрыяцельск[...] пазыцыі. У часе паўторнай начной атакі, паўднявей даро[...] мы адкінулі ніпрыяцеля контр-атакаю. Моцны агонь цягнуў[...] каля ручая Люс і на заходнім беразі Аўры. Больш на фро[...]ці нічога выдатнаго.

На іншых тэатрах вайны, ніякай навіны.

Першы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **Т-во «Заранка».**